**24.** Якое ўстойлівае спалучэнне адпавядае прыслоўю ***цёмна***?

**А)** без году тыдзень. **Б)** не за гарою. **В)** хоць вока выкалі.
**Г)** ні даць ні ўзяць. **Д)** гады ў рады.

---

**25.** Якія ўласныя назоўнікі прапушчаны ва ўстойлівых спалучэннях?

*1) яшчык …;* *а) Рубікон;*
*2) куды … цялят не ганяў;* *б) Пандоры;*
*3) перайсці …;* *в) Аргуса;*
*4) па … шапка;* *г) Сеньку;*
*5) вочы …* *д) Макар.*

**А)** 1-а, 2-г, 3-б, 4-в, 5-д. **Б)** 1-б, 2-д, 3-а, 4-г, 5-в. **В)** 1-в, 2-б, 3-д, 4-а, 5-г.
**Г)** 1-г, 2-б, 3-в, 4-д, 5-а. **Д)** 1-д, 2-б, 3-в, 4-а, 5-г.

---

**26.** Вучні атрымалі заданне напісаць сачыненне пра свае назіранні за прыродай падчас летніх канікул. Кастусь запісаў: *"У добрае надвор'е, калі не чакаецца рэзкіх перамен, п'яўкі спакойна поўзаюць па дне вадаёма, камянях, воднай расліннасці. А калі яны пачынаюць вылазіць па сцёблах да самай паверхні вады, то ў бліжэйшы час будзе … ."* Якое слова не напісаў хлопчык?

**А)** засуха. **Б)** паводка. **В)** спёка. **Г)** навальніца. **Д)** вецер.

---

**27.** Дадзены ўстарэлыя словы: *1) перст; 2) чало; 3) ланіты; 4) выя; 5) длань.* Што яны абазначалі? Падбярыце сучасныя адпаведнікі.

*а) лоб; б) шчокі; в) палец; г) далонь; д) шыя.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г, 5-д. **Б)** 1-б, 2-в, 3-д, 4-а, 5-б. **В)** 1-в, 2-а, 3-б, 4-д, 5-г.
**Г)** 1-г, 2-д, 3-г, 4-в, 5-а. **Д)** 1-д, 2-г, 3-а, 4-б, 5-в.

---

**28.** Дадзены назвы народных казак: *1) "…-рабка"; 2) "…-хітрыца"; 3) "…-пяюха"; 4) "…-манюка"; 5) "…-сынок".* Якіх назоўнікаў на месцы пропуску не хапае? Выберыце патрэбны варыянт.

*а) Каза; б) Лісіца; в) Курачка; г) Піліпка; д) Муха.*

**А)** а1, б2, в3, г4, д5. **Б)** а1, г2, д3, в4, б5. **В)** б1, а2, г3, д4, в5.
**Г)** в1, б2, д3, а4, г5. **Д)** г1, д2, в3, б4, а5.

---

**29.** Як даўней называлі памяшканне, дзе захоўвалі калёсы, сані, сохі, бароны, плугі, вілы, капаніцы?

**А)** дрывотня. **Б)** сцёбка. **В)** гумно. **Г)** абозня. **Д)** стайня.

---

**30.** *Даследчык старажытных рукапісаў* называецца … .

**А)** палеограф. **Б)** археолаг. **В)** геолаг. **Г)** архівіст. **Д)** вандроўнік.

---

КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб'яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»
220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/
Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 2. Тыраж 28300 экз. 2021 г.

Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры

# «БУСЛІК-2021»

*Чацвер, 18 лютага 2021 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Колькі назоўнікаў з [ж] у скорагаворцы У. Ліпскага?

*Жабка збірае журавіны,*
*Жменькай жахае ў жбан.*

**А)** 0. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**2.** Вучні атрымалі заданне скласці сказ. Сымонка напісаў:

*Восенню на балоце збіраюць … .*

Дапамажыце хлопчыку закончыць сказ.

**А)** маліну. **Б)** чарніцы. **В)** журавіны. **Г)** грыбы. **Д)** суніцы.

---

**3.** Якое(-ія) слова(-ы) з дадзеных пачынаецца з [йо]?

*1) ежа; 2) ёрш; 3) радыё; 4) перыёдыка.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3, 4.

---

**4.** Чым з'яўляецца выдзеленае спалучэнне ў вершаваных радках А. Дзеружынскага?

*Мама кажа:*
*– Наш Пятрок*
*мае* ***востры язычок****!*
*– Дык чаму ж, – спытала Люба, –*
*не парэжа Пеця губы?*

**А)** сінонімам. **Б)** амонімам.
**В)** антонімам. **Г)** неалагізмам.
**Д)** фразеалагізмам.

**5.** У якім (ці якіх) з прапанаваных устойлівых спалучэнняў прапушчаны прыметнік ***леташні***?

*1) дрыжыць як … ліст; 2) патрэбны як … снег; 3) не … зуб, дык лісіны хвост.*

**А)** ва ўсіх. **Б)** няма такіх. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

**6.** Выберыце з дадзеных прыкладаў толькі адназначныя словы.

*1) выказнік; 2) тэарэма; 3) космас.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**7.** Дадзены сказ: *Расце ў лесе* ***магутны*** *дуб.* Падбярыце з наступных слоў сінонім да выдзеленага слова.

*1) нізкарослы; 2) слабы; 3) вялікі; 4) непрыкметны.*

**А)** няма такога слова. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**8.** Здаўна ў народзе можна пачуць:

| | |
|---|---|
| *1. Колас не спее, калі сонца не … .* | *а) псуе;* |
| *2. Праца чалавека корміць, а лянота … .* | *б) грэе;* |
| *3. Мурашка невялікая, а горы … .* | *в) капае.* |

Якія дзеясловы прапушчаны?

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-б, 2-а, 3-в. **В)** 1-б, 2-в, 3-а. **Г)** 1-в, 2-б, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

**9.** Якія з прыведзеных назоўнікаў ужываюцца толькі ў множным ліку?

*1) сані; 2) апілкі; 3) дажынкі; 4) вароты.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**10.** Выберыце з дадзеных правільна напісаныя словы.

*1) глаток; 2) спектакаль; 3) пясчота; 4) мятро.*

**А)** усе словы. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**11.** У якіх словах з прапанаваных колькасць літар аднолькавая?

*1) ясны; 2) сшытак; 3) з’езд; 4) кальё.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 3, 4.

**12.** Дадзены сказ: *На шэрую прамерзлую зямлю бязгучна і* ***густа*** *сыплецца першы снег.* Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае ў сказе слова?

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** лічэбнікам. **Г)** займеннікам. **Д)** прыслоўем.

**13.** Колькі разоў сустракаецца апошні гук назоўніка ***сталь*** у словах вершаванай загадкі Н. Гілевіча?

*Поле – шкляное,*
*Празрыстае,*
*Чыстае,*
*Межы – драўляныя,*
*Падмаляваныя. (Акно)*

**А)** ні разу. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**14.** Ужыты ў выразах *вывучыцца грамаце, ганаровая грамата, грамата на бяросце, фількіна грамата* назоўнік ***грамата*** з’яўляецца … .

**А)** адназначным. **Б)** мнагазначным. **В)** амонімам.
**Г)** паронімам. **Д)** сінонімам.

**15.** Дадзены словы рускай мовы: *1) щепотка; 2) наружный; 3) почечный; 4) невольно.* Падбярыце адпаведнікі ў беларускай мове:

*а) вонкавы; б) ныркавы; в) дробка; г) міжволі.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-в, 3-г, 4-а. **В)** 1-в, 2-а, 3-б, 4-г.
**Г)** 1-г, 2-б, 3-а, 4-в. **Д)** 1-а, 2-г, 3-в, 4-б.

**16.** Выберыце з прапанаваных формы вуснага маўлення.

*1) маналог; 2) дыялог; 3) палілог.*

**А)** усе. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**17.** Вучні атрымалі заданне напісаць назоўнік, якому адпавядае значэнне *‘першы паказ спектакля, цыркавой праграмы, фільма’*.

Дзіма напісаў – *прэм’ера*, Варвара – *прэмьера*, Клава – *прым’ера*, Стас – *премьера*, Філіп – *прам’ера*. Хто з вучняў правільна напісаў назоўнік?

**А)** Дзіма. **Б)** Варвара. **В)** Клава. **Г)** Стас. **Д)** Філіп.

**18.** Дадзены словы на рускай мове: 1*) аллея; 2) примадонна; 3) шасси.* Пры перакладзе якога слова з рускай мовы на беларускую захаваецца падаўжэнне зычных?

**А)** усіх слоў. **Б)** няма такіх слоў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**19.** У даўнія часы расчараванне з-за няўдачы ў якіх-небудзь непрадбачаных абставінах у народзе выказвалі такім чынам: *“Вось табе, бабуля, і … дзень.”* Якое слова прапушчана ў выразе?

**А)** Агаф’еў. **Б)** Сідараў. **В)** Ільін. **Г)** Трыфанаў. **Д)** Юр’еў.

**20.** Дадзены назоўнікі: *прыз, рак, мель.* Які склад неабходна выкарыстаць у пачатку прапанаваных слоў, каб атрымаліся назоўнікі з іншымі лексічнымі значэннямі?

**А)** ку-. **Б)** ка-. **В)** кэ-. **Г)** кы-. **Д)** ко-.

**21.** Якія з прапанаваных нескланяльных складанаскарочаных назоўнікаў адносіцца да ніякага роду?

*1) БелАЗ; 2) ААН; 3) ТБМ.*

**А)** усе. **Б)** няма такіх. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**22.** Выберыце з дадзеных словазлучэнні, у якіх выдзеленыя словы з’яўляюцца амонімамі.

*1) мяккі знак – мяккі характар; 2) геаграфічны áтлас – бліскучы атлáс;*
*3) ідуць урокі – ідуць гадзіны.*

**А)** усе. **Б)** няма такіх. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**23.** Дадзены перыфразы: *1) карабель пустыні; 2) марскі артыст; 3) велікан саванны.* Падбярыце адпаведнікі: *а) дэльфін; б) вярблюд; в) слон.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в.
**Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.